**Фразеалагізмы** – сінтаксічна непадзельныя адзінкі, гэта значыць выступаюць у ролі аднаго члена сказа. Яны не з'яўляюцца часцінамі мовы, але па значэнні і сінтаксічнай функцыі адпавядаюць пэўным часцінам мовы: **назоўнікам** (***грушы на вярбе*** – хлусня, небыліцы; ***кракадзілавы слёзы*** – прытворнае шкадаванне), **прыметнікам** (***лісам падшыты*** – вельмі хітры; ***кроў з малаком*** – здаровы, моцны), **дзеясловам** (***задраць нос*** – зазнацца; ***крывіць душой*** – пастурпаць няшчыра, падманваць) і г.д. Фразеалагізмы значна ажыўляюць мову, робяць яе вобразнай, эмацыянальнай, сакавітай, дапамагаюць пазбегнуць паўтораў. Асабліва ярка гэта праяўляецца ў мове мастацкай літаратуры і публіцыстыкі. Вывучае фразеалагізмы параўнальна новы раздзел мовазнаўства – **фразеалогія**.

**Як адрозніць свабоднае словазлучэнне ад фразеалагізма**

| Свабоднае словазлучэнне | Фразеалагізм |
|---|---|
| ***Склаўшы рукі*** *на грудзях, ён глядзеў удалеч.* | *Ён не можа сядзець* ***склаўшы рукі****.* |
| Кожнае слова ў словазлучэнні мае сваё значэнне: *склаўшы* – ʼразмясціўшы перад сабойʼ; *рукі* – ʼверхнія канечнасці чалавекаʼ. | Сэнс не вынікае са значэння асобных слоў. Усё спалучэнне мае адно значэнне: *склаўшы рукі* – ʼбез справыʼ. |
| Магчыма замена слоў: ***Перакрыжаваўшы рукі*** *на грудзях, ён глядзеў удалеч.* | Немагчыма замена слоў. |
| Утвараецца ў працэсе маўлення. | Ужываецца ў маўленні як гатовая адзінка мовы. |

**Выканайце наступныя заданні.**

| ***Выпішыце фразеалагізмы*** | ***Спішыце, падкрэсліце фразеалагізмы.*** |
|---|---|
| Даць маху, даць падручнік, падаць руку дапамогі, падаць руку, (усё) валіцца з рук, валіцца дрэва, рукой падаць, падаць кнігу, брацца за галаву, брацца за справу, малоць языком, малоць зерне, вастрыць зубы, вастрыць нож, кляваць носам, кляваць зерне, як піць даць, трэба даць піць. | 1. Да гэтага мястэчка ад нас рукой падаць. 2. Разведчыкі з выгляду зухаватыя, рашучыя. Любяць пусціць пыл у вочы. 3. Яшчэ зімою ў восьмым класе Ірачка ўбіла сабе ў галаву, што яна будзе доктарам, для пачатку хаця б медсястрою. 4. Косцік яшчэ больш разгубіўся, збянтэжыўся – яго ж не цягнулі за язык, навошта было ва ўсім гэтак шчыра прызнавацца? |